# ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАЙ КАРТАГРАФІІ БЕЛАРУСІ Ў ВЫДАННЯХ УП "АРТЫ-ФЭКС"

***Казлоў Леў Раманавіч,*** *кандыдат гістарычных навук, генеральны дырэктар УП "Арты-Фэкс"*

Адным з накірункаў выдавецкай дзейнасці УП "Арты-Фэкс" з'яўляецца збор, сістэматызацыя і публікацыя картаграфічных твораў, што прадстаўляюць землі Беларусі ў мінулым. Падобныя матэрыялы маюць выключнае значэнне ў якасці яшчэ незасвоенных гістарычных крыніц, а таксама — у краязнаўчай і асветніцкай дзейнасці. А да таго ж старажытныя карты — сваеасаблівыя помнікі навукі і культуры, якія сваім агульным афармленнем заўжды канцэнтравана ўвасаблялі найболей характэрныя рысы свайго часу, сваёй краіны. На адным такім аркушу змяшчаліся побач палітыка дзяржавы, стан гаспадарчага развіцця, мастацка-дэкаратыўны стыль і нават... мода. Толькі на старажытнай карце нярэдка можна знайсці такое, чаго ніколі не сустрэнеш у самых падрабязных хроніках. Здавалася б, што несумненная рознабаковасць інфармацыі, якая закладзена ў такіх помніках мінуўшчыны, павінна б даўно прыцягнуць увагу даследчыкаў і аматараў старадаўнасці. Але на практыцы беларускія картазборы застаюцца "тэра інкогніта". А між тым, тэрыторыя Беларусі мае даволі вялікую картаграфічную спадчыну, што пераўзыходзіць у колькасных і якасных адносінах многіх бліжніх і дальніх суседзяў. Таму гэтае "неўзаранае поле" і прыцягнула выдавецкую ўвагу прадпрыемства.

Картаграфія адразу ж заняла дастойнае месца з першых год існавання фірмы, а пачатковымі практычнымі крокамі было выданне шэрагу даведнікаў "Бізнес і турызм", але асноўныя намаганні паступова перайшлі ў адукацыйную сферу.







Першыя адукацыйна-асветніцкія публікацыі УП "Арты-Фэкс"

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

УП "Арты-Фэкс" падрыхтаваў і стаў штогод выдаваць значнымі тыражамі "Атлас гісторыі Беларусі". Каляровы і ілюстраваны, з адпаведна распрацаванай структурай, ён адрасаваўся не толькі навучэнцам сярэдніх школ, але і ўсім, хто імкнуўся атрымаць цэласнае ўяўленне аб гісторыі роднай зямлі праз картаграфічныя вобразы. Менавіта на яго старонках упершыню з'явілася выявы твораў А. Паграбкі "Еўрапейская Сарматыя" (1569) з паказам побытавых сцэн тагочаснага жыцця, карта Т. Майера, на якой упершыню назва "Белая Русь" пазначана ад Берасцейскага да Полацкага ваяводстваў (1750). І самае галоўнае – у гэтым папулярным атласе былі прадстаўлены ў поўны разварот беларускія землі на карце "Вялікага княства Літоўскага (1613), складзенай у Нясвіжы пад кіраўніцтвам князя М. Радзівіла "Сіроткі".

У пачатку бягучага тысячагоддзя былі таксама падрыхтаваны да друку і іншыя агульнаадукацыйныя атласы – старажытнага свету, для старшых класаў сярэдняй школы і інш. Але па эканамічных ды іншых прычынах гэта праца была спынена.




У "Падарожніку" друкаваліся старажытныя карты

У тыя ж гады гісторыка-картаграфічная тэматыка адлюстроўвалася і ў штомесячным краязнаўчым часопісу "Падарожнік", заснаваным УП "Арты-Фэкс". Кожны яго нумар адкрываўся зборнай табліцай знакамітай "трохвярстоўкі" (1:126000) – лепшай карты еўрапейскай часткі Расійскай імперыі сярэдзіны XIX ст. Выбіраўся адзін з 75 аркушаў гэтага твора, які з суправаджальным тэкстам друкаваўся ў часопісе. Такім чынам, кожны падпісчык паступова мог сабраць поўны картаграфічны збор з гісторыка-геаграфічным апісаннем Беларусі пазамінулага стагоддзя. Картаграфічныя матывы нярэдка гучалі і ў другой рубрыцы – "Гісторыя адной ілюстрацыі". "Падарожнік" пакуль прыпыніў сваё існаванне па прычынах, згаданых вышэй.

Найболей абгрунтаванымі і фундаментальнымі публікацыямі, на якія нават не ўздзейнічалі цяжкасці пераходнага перыяду, стала падрыхтоўка і друкаванне кніг, прысвечаных гісторыі старажытнай картаграфіі. Першай у гэтым шэрагу з'явілася "Беларусь на сямі ру-

РЭПАЗІТАРЫЙ БДУКІ

бяжах" (Мн., 2000). У кнізе на падставе картаграфічных матэрыялаў быў паказаны амаль тысячагадовы працэс складвання будучай тэрыторыі Беларусі, вызначаны тыя часткі сучасных межаў, якія ніколі не мяняліся — своеасаблівыя "краявугольныя камяні", што сфарміравалі яе сёняшні абрыс. У гэтую "сямёрку" увайшлі: "Літоўскае сумежжа", "Лівонская граніца", "Пскоўская мяжа", "Смаленскі край", "Северская старана", "Палеская ўскраіна" і "Падляшскі рубеж". Усе пазначаныя межы адлюстроўваліся адпаведнымі картаграфічнымі фрагментамі.




Першая кніга са старажытнай картаграфіяй Беларусі




Брашуры, надрукаваныя да навуковых канферэнцый

Назапашаны вопыт і павелічэнне уласнай калекцыі картаграфічных твораў, у тым ліку і арыгінальных, што з'явіліся у мінулыя стагоддзі, знаёмства са спецыяльнай літаратурай, праца ў замежных архівах, удзел у розных канферэнцыях, сустрэчы з вядучымі прадстаўнікамі дадзенай навуковай галіны, а, галоўнае, асветніцкае імкненне зрабіць даступным гэткае картаграфічнае багацце – дазволілі ўзняць выдавецкую справу разам з попытам на болей высокі ўзровень. У выніку ў свет выйшла кніга "Беларусь у працах польскіх картографаў" – першая з серыі "Беларусь на старажытных картах". Паралельна складаліся атласы другой серыі: "Старажытная картаграфія Беларусі" у сямі выпусках. Дарэчы, ужо надрукаваны першы з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

выпускаў, у які ўвайшлі творы Г. Меркатара, Н. Сансона, А. Шатэлена, І. Няпрэцкага, Б. Фаліна, В. Пядышава і інш. Да друку падрыхтаваны і другі выпуск з гэтай серыі, у якім прадстаўлены такія картаграфічныя знакамітасці, як К. Пталемей, М. Бенявенцкі, С. Мюнстэр, Г. дэ Баплан, К. Аперман, В. Хшаноўскі, І. Стральбіцкі. Рыхтуецца таксама змест кнігі “Беларусь у працах расійскіх картографаў”.




Чарговыя выданні па гісторыі старажытнай картаграфіі

У перспектыве па картаграфічнай тэматыцы ідзе праца над наступнымі тэмамі: “Як адкрывалі Белую Русь”, “Гістарычная геаграфія Беларусі”, “Палессе на старажытных картах”.

Паліграфічныя магчымасці УП “Арты-Фэкс” не дазваляюць рабіць вялікія тыражы гэтых карысных асветніцкіх выданняў, таму кааперацыя з дзяржаўнымі прадпрыемствамі магла б прынесці больш значны плён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КНІГАВЫДАННЕ Ў БЕЛАРУСІ

***Слізкі Міхаіл Іванавіч****, выкладчык кафедры народна-інструментальнай творчасці БДУКМ*

Кнігавыдавецкая справа ў Беларусі мае даўнія традыцыі. Яна пачала развівацца ў эпоху Адраджэння і свайго апагею дасягнула ў XVI ст. На пачатак XVIII ст. у Беларусі было надрукавана каля 4000 назваў кніг. Кнігі друкавалі ў Нясвіжы, Лоску, Любчы, Брэсце. Некаторыя з іх дайшлі да нашага часу і знаходзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, у бібліятэках Расіі і дальняга замежжа. Старажытныя беларускія кнігі ўражваюць